Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 11 (661) Пятніца, 24 сакавіка 1967 года. Год выд. XX. Цана 2 кап.

Наш фотакарэспандэнт А. Кадзет зазняў хвалюючы момант урачыстага сходу: кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі П. М. Машэраў уручае высокую ўрадавую ўзнагароду рэктару універсітэта акадэміку А. Н. Сеўчанку.

Узнагарода Радзімы — НА СЦЯГУ ФЛАГМАНА БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ

ГЭТЫ дзень запамятаецца на ўсё жыццё. Аўторак, 21 сакавіка 1967 года. Гасцінна адкрыты дзверы галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У вестыбюлі яркімі фарбамі ззяе ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, а побач ужо знаёмыя радкі Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні нашага універсітэта ордэнам за заслугі ў развіцці навукі і падрыхтоўцы спецыялістаў.

Гучыць музыка. Прафесары, выкладчыкі, аспіранты, студэнты, рабочыя і служачыя, шматлікія госці ў святочным адзенні. Ва ўсіх на тварах усмешкі і радасць. Так, слаўны калектыў сёння перажывае шчаслівы дзень — уручэнне ўзнагароды Радзімы.

Ардэнаносны універсітэт у гэтыя дні уносіць вялікі ўклад у камуністычнае будаўніцтва, у паспяховую падрыхтоўку да 50-годдзя Савецкай улады і 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Узятыя у гонар гэтых юбілеяў сацыялістычныя абавязацельствы выконваюцца і перавыконваюцца.

Зала зацісхае. У прэзідыуме ўрачыстага сходу, прысвечанага ўручэнню флагману беларускай навукі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга — ветэраны універсітэта, буйныя вучоныя, акадэмікі, прафесары, студэнты, людзі, якімі ганарыцца ўвесь калектыў, якія паўсядзённа памнажаюць яго славу. Бурнымі апладысментамі сустракаюць прысутныя паяўленне ў прэзідыуме кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі П. М. Машэрава. Месцы ў прэзідыуме займаюць таксама намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР І. Ф. Клімаў, загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ М. Ф. Капіч, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. В. Дарашэвіч, міністр асветы БССР Р. Я. Кісялёў, сакратар Мінскага абкома КПБ Л. Ц. Караткевіч, сакратар Мінскага гаркома КПБ В. Я. Лежапёкаў, першы сакратар ЦК ЛКСМБ Г. М. Жабіцкі, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР Кандрат Крапіва, народны паэт Беларусі П. У. Броўка, рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна А. Н. Сеўчанка і іншыя.

Сакратар парткома універсітэта дацэнт Т. Я. Дударава адкрывае ўрачысты сход. Па яе прапанове прысутныя з вялікім уздымам выбіраюць ганаровы прэзідыум сходу ў саставе Палітбюро ЦК КПСС.

Гучыць урачысты марш. Пад яго гукі сцяганосцы — адзін са старэйшых выкладчыкаў дэкан біялагічнага факультэта П. Р. Пятровіч, дацэнт Герой Савецкага Саюза А. А. Філімонаў і дацэнт А. І. Кажушкоў — уносяць у залу сцяг універсітэта. Усе ўстаюць.

Кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў ад імя ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў БССР сардэчна вітае выкладчыкаў, студэнтаў і служачых. Ён зачытвае Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні Беларускага дзяржаўнага універсітэта і пад гул апладысментаў усёй залы прымацоўвае да сцяга універсітэта ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Хвалюючыя мінуты перажывае кожны прысутны.

І зноў авацыі—П. М. Машэраў моцна паціскае руку рэктару А. Н. Сеўчанка, сакратару парткома Т. Я. Дударавай, старшыні мясцкома І. Т. Рагоўскаму, сакратару камітэта камсамола М. Д. Ціве, старшыні прафкома Ул. З. Рабушку.

Тав. Машэраў П. М. звяртаецца да прысутных з вялікай прамовай, якая была выслухана ўважліва і не раз перапынялася апладысментамі.

Са словам у адказ выступіў рэктар БДУ імя У. І. Леніна А. Н. Сеўчанка. Прафесараў, выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў, рабочых і служачых сардэчна вітаюць міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. В. Дарашэвіч, сакратар Мінскага абкома КПБ А. Ц. Караткевіч, першы сакратар ЦК ЛКСМБ Г. М. Жабіцкі, былы выхаванец універсітэтца рэктар Мінскага педінстытута І. Е. Лакін, галоўны рэдактар Беларускай Савецкай энцыклапедыі народны паэт Беларусі П. У. Броўка.

Са словамі гарачай падзякі за высокую ўрадавую ўзнагароду, якой удастоен універсітэт, выступілі загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі прафесар І. М. Лушчыцкі, студэнт V курса фізфака Нгуен Куанг Мінь і студэнтка III курса філфака Тамара Скудная.

Апладысментамі, словамі падзякі сустракаюць прысутныя шматлікія прывітанні, тэлеграмы і пісьмы, якія зачытвае Т. Я. Дударава.

Урачыста пад гукі марша выносіцца сцяг універсітэта. На ім ярка ззяе ордэн — прызнанне вялікіх заслуг флагмана беларускай навукі ў сацыялістычным і камуністычным будаўніцтве.

У заключэнне адбыўся вялікі канцэрт, у якім прынялі ўдзел майстры мастацтваў рэспублікі і калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта.

Ніжэй мы друкуем прамовы выступіўшых на ўрачыстым сходзе.

АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЬ ВЯЛІКІЯ ІДЭАЛЫ КАМУНІЗМА

(З прамовы кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі П. М. МАШЭРАВА)

— У нашай рэспубліцы,—гаворыць П. М. Машэраў, — сапраўды няма такога кутка, дзе б мы не сустрэлі педагогаў, юрыстаў, урачоў, эканамістаў і іншых выхаванцаў універсітэта. Выхаванцы Беларускага універсітэта паспяхова працуюць на вытворчасці і ў школе, у навуковых лабараторыях і ва ўстановах культуры, у прэсе і на радыё, у творчых саюзах, у партыйных, дзяржаўных і грамадскіх органах і арганізацыях.

Радасна адзначыць, што пераважная большасць выпускнікоў універсітэта — гэта выдатныя і добрыя спецыялісты, якія валодаюць высокай тэарэтычнай падрыхтоўкай, глыбока ведаюць сваю справу, умеюць творча ўжываць атрыманыя веды, ісці ў нагу з патрабаваннямі жыцця, быць у курсе дасягненняў сучаснай навукі і тэхнікі.

Гаворачы аб заслугах універсітэта перад нашым народам, трэба асабліва падкрэсліць той факт, што іменна універсітэт адыграў вялікую ролю ў культурным пераўтварэнні Беларусі, у стварэнні нацыянальнай савецкай інтэлігенцыі рэспублікі. Універсітэт выхаваў многіх вядомых беларускіх вучоных, пісьменнікаў, дзяржаўных дзеячоў. Выпускнікі універсітэта складаюць значную частку прафесараў і выкладчыкаў усіх вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі.

На базе факультэтаў універсітэта былі створаны іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы — медыцынскі інстытут, педагагічны інстытут, інстытут народнай гаспадаркі, політэхнічны інстытут. Універсітэт зрабіў значны ўклад у стварэнне Акадэміі навук БССР і пастаянна папаўняе яе навуковыя ўстановы маладымі кваліфікаванымі кадрамі.

Цяпер універсітэт рыхтуе кадры і па тых спецыяльнасцях, якія народжаны сучасным навукова-тэхнічным прагрэсам: радыёэлектронікі і аўтаматыкі, паўправадніках, ядзернай фізікі і тэхнікі, атамнай і малекулярнай спектраскапіі, квантавай радыёэлектронікі, вылічальнай матэматыкі, біяфізікі і біяхімії.

Уручэнне ордэна універсітэту — гэта высокая ацэнка сур'ёзнага ўкладу яго выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў у развіццё раду галін савецкай навукі. Шырокае прызнанне атрымала школа фізікаў, якая склалася тут, на чале з акадэмікамі АН БССР А. Н. Сеўчанкам, М. А. Ельяшэвічам і Б. І. Сцяпанавым. Значных поспехаў дабілася школа матэматыкаў, якая пад кіраўніцтвам акадэмікаў АН БССР М. П. Яруціна

(Працяг на 2 стар.).

АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЬ ВЯЛІКІЯ ІДЭАЛЫ КАМУНІЗМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.).

і У. І. Крылова вядзе работу ў галіне дыферэнцыяльных ураўненняў і вылічальнай матэматыкі. У апошнія гады пачалі больш актыўна займацца даследаваннем актуальных навуковых праблем і іншыя кафедры прыродазнаўчых, гуманітарных і грамадскіх навук.

Мы віншуем калектыў універсітэта ў сувязі з узнагароджаннем і ўручэннем яму высокай урадавай узнагароды ў знамянальны час, напярэдадні 50-годдзя Савецкай улады. У гэтыя дні наша партыя, савецкі народ падводзяць вынікі пройдзенага шляху за цэлую гістарычную эпоху, якая прадэманстравала ўсяму свету, што толькі сацыялізм адкрывае неабмежаваную прастору развіццю прадукцыйных сіл, уздыму матэрыяльнага дабрабыту народа, стварае самыя спрыяльныя ўмовы для росквіту навукі і культуры, для ўсебаковага развіцця асобы.

За гэтыя гады Беларусь, абапіраючыся на шчодрую, бескарыслівую дапамогу савецкіх народаў-братоў і перш за ўсё рускага народа, ператварылася з адсталай ускраіны царскай Расіі ў высокаразвітую сацыялістычную рэспубліку.

Буржуазная прапагандысцкая машына спрабуе пасеяць разлад паміж нашымі брацкімі народамі, проціпаставіць іх адзін аднаму. Нацыяналізм і шавінізм сталі цяпер вядучымі матывамі антыкамунізма. На жаль, за апошнія гады да нацыяналістычных, шавіністычных пазіцый скаціліся і кіраўнікі КПК, наносячы вялікую шкоду справе пралетарскай салідарнасці і сацыялістычнай рэвалюцыі.

Не трэба, таварышы, забываць і таго, што ідэалагічная барацьба не выключае з планаў імперыялістаў узброенай барацьбы супраць сусветнай сацыялістычнай сістэмы на чале з Савецкім Саюзам. Прадвесцем магчымых ваенных авантур з боку імперыялізму могуць служыць брудная вайна ЗША ў В'етнаме, авантурызм бонскіх рэваншыстаў і іншых імперыялістычных правакатараў. Вось чаму ў нашага народа, і асабліва моладзі, трэба пастаянна выхоўваць гатоўнасць не толькі да ідэалагічнай барацьбы з імперыялізмам, але і гатоўнасць, калі запатрабуецца, са зброяй у руках абараняць заваёвы Вялікага Кастрычніка.

Гаворачы аб задачах вышэйшай школы ў ідэйным выхаванні савецкіх людзей, П. М. Машэраў падкрэслівае, што маладыя спецыялісты, якія заканчваюць вышэйшыя навучальныя ўстановы, павінны не толькі валодаць найноўшымі спецыяльнымі ведамі, але і быць выхаванымі ў духу высокай камуністычнай свядомасці, быць добра ўзброенымі марксісцка-ленінскай тэорыяй, павінны валодаць навыкамі арганізатарскай, масава—палітычнай і выхаваўчай работы.

— Адной з важнейшых умоў павышэння ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў, — працягвае П. М. Машэраў, — з'яўляецца расшырэнне навуковай работы ў ВНУ. Імкліва развіваючыся, навука ўсё больш становіцца непасрэднай прадукцыйнай сілай. Народнагаспадарчыя задачы ўсё цясней пераплятаюцца з вялікімі тэхнічнымі і навуковымі праблемамі. Без дасягненняў перадавой навукі цяпер нельга абысціся ні ў адной галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, абслугоўвання і быту.

Адзін з кардынальных напрамкаў у гэтай справе — актыўны ўдзел ВНУ рэспублікі ў ажыццяўленні новай сістэмы планавання і эканамічнага стымулявання вытворчасці. Мы маем права разлічваць, што эканамічныя кафедры ўсіх ВНУ і Белдзяржуніверсітэта ў прыватнасці будуць аказваць больш эфектыўную дапамогу народнай гаспадарцы ў справе вывучэння і абагульнення гэтай работы. Нам уяўляецца вельмі своечасовым рашэнне аб падрыхтоўцы ва універсітэце спецыялістаў па палітычнай эканоміі.

Мы маем права чакаць, што універсітэт, які валодае дастатковай матэрыяльнай базай і кваліфікаванымі кадрамі, зможа ўдасканальваць навуковую і педагагічную дзейнасць, паляпшаць падрыхтоўку кадраў і па іншых спецыяльнасцях.

Рыхтуючыся да 50-годдзя Савецкай улады, мы асабліва адчуваем неабходнасць далейшага ўзмацнення дзейнасці кафедраў грамадскіх навук, больш паглыбленага даследавання гісторыка-партыйнай тэматыкі, праблем станаўлення сацыялізма і яго перарастання ў камунізм. Па асобных пытаннях гісторыі партыі, філасофіі, палітэканоміі, навуковага камунізма супрацоўнікамі універсітэцкіх кафедраў апублікаван рад работ. Аднак наша грамадскасць чакае ад іх буйных навуковых даследаванняў і абагульненняў важнейшых падзей, якія адбываліся як у цэлым у краіне, так і на тэрыторыі Беларусі ў сувязі з падрыхтоўкай і ажыццяўленнем Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і правядзеннем сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. Рашэннем нацыянальнага пытання і ўмацаваннем дружбы народаў, у сувязі з бурным развіццём сацыялістычнай эканомікі, навукі і культуры.

Спыніўшыся далей на задачах вышэйшай школы, літаратуры і мастацтва ў выхаванні новага чалавека, чалавека творчай натхнёнай працы, што аддае ўвесь агонь свайго сэрца, усе свае здольнасці і таленты светлым ідэалам, за якія змагаецца наша партыя і народ, П. М. Машэраў у заключэнне гаворыць:

Дазвольце мне ад імя Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі і ўрада рэспублікі выказаць цвёрдую ўпэўненасць у тым, што выдатны калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна будзе і ў далейшым выхоўваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, гарачых патрыётаў, свядомых і ідэйна загартаваных барацьбітоў за ажыццяўленне вялікіх ідэалаў камунізма.

Прамова П. М. Машэрава была выслухана з вялікай увагай і не раз перапынялася апладысментамі.

СЭРЦА ПОЎНІЦЦА РАДАСЦЮ

(З прамовы студэнткі трэцяга курса філалагічнага факультэта ТАМАРЫ СКУДНАЙ)

Нашы студэнцкія сэрцы перапоўнены радасцю і гонарам за родны універсітэт. З розных гарадоў і вёсак рэспублікі прыехалі мы сюды з адной мэтай — пазнаць тайны навукі і стаць спецыялістамі сваёй справы. Ва універсітэцкіх аўдыторыях нас вучаць па сапраўднаму любіць фізіку і матэматыку, гісторыю і геаграфію, хімію і літаратуру, вучаць любіць і шанаваць працу.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад прадаставілі нам магчымасць, як і іншым сотням, тысячам юнакоў і дзяўчат нашай краіны, здзейсніць свае мары, стаць высокаадукаванымі людзьмі.

На нас ускладаюцца вялікія надзеі, таму што іменна нам прадстаіць будаваць самае цудоўнае грамадства на зямлі — камунізм. І мы зробім усё, каб апраўдаць гэтыя надзеі: будзем старацца лепш вучыцца, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, дапамагаць калгасам і саўгасам ва ўборцы ўраджаю, паедзем на цаліну, пабудуем школы, клубы, новыя пасёлкі. І ва ўсіх гэтых справах мы будзем ісці поруч з нашымі выдатнымі выкладчыкамі, нашымі натхняльнікамі і выхавацелямі.

Ад імя шматтысячнага студэнцкага калектыва я заяўляю, што мы, студэнты Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, прыкладзем усе сілы для таго, каб стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі і пачэсна выконваць свой абавязак перад Радзімай.



Ганаровае права ўнесці сцяг універсітэта даручана старэйшаму выкладчыку кавалеру ордэна Леніна дэкану біялагічнага факультэта П. Р. Пятровічу, дацэнту Герою Савецкага Саюза А. А. Філімонаву, дацэнту А. І. Кажушкову. Вы бачыце іх на гэтым здымку.

Фота **А. Кадзета.**

ВЕРНАСЦЬ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАМУ ДАЎГУ

(З прамовы студэнта пятага курса фізічнага факультэта Нгуен Куанг Міня)

Ва універсітэце нас, замежных студэнтаў, акружаюць старанными клопатамі, паўсядзённай увагай і сапраўднай дружбай. Рэктарат і грамадскія арганізацыі універсітэта заўсёды ствараюць для нас добрыя ўмовы для жыцця і вучобы. Прафесары, выкладчыкі і супрацоўнікі гатовы ў любы час прыйсці нам на дапамогу.

Заслуга нашага універсітэта не толькі ў тым, што ён рыхтаваў і рыхтуе высококваліфікаваныя кадры для Савецкага Саюза, але і ў тым, што ён рыхтуе гэтыя кадры для брацкіх сацыялістычных краін і краін нацыянальнага развіцця. Гэтым самым універсітэт уносіць канкрэтны цэнны ўклад у выкананне Савецкім Саюзам інтэрнацыянальнага доўгу.

Праз некалькі месяцаў вялікая колькасць замежных студэнтаў закончыць універсітэт і выедзе да сябе на Радзіму. Але мы ўжо цяпер гаворым: назаўсёды запомнім наш універсітэт, дзе мы атрымліваем пуцёўкі ў жыццё, ніколі не забудзем тых, хто аддаваў нам штодзённа свае веды.

Мы вельмі ганарымся, што з'яўляемся студэнтамі універсітэта, які носіць імя Вялікага Леніна, што з'яўляемся студэнтамі універсітэта ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. І сёння мы запэўніваем усіх вас, што будзем дастойны высокай узнагароды.

Апраўдаем давер'е

(З прамовы рэктара БДУ імя У. І. ЛЕНІНА акадэміка А. Н. СЕЎЧАНКІ)

ЗПАЧУЦЦЁМ глыбокага хвалявання прымаем мы сёння высокую ўрадавую ўзнагароду— ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. У гэты радасны дзень мы яшчэ і яшчэ раз ад усёй душы выражаем нашу шчырую падзяку Ленінскай партыі, савецкаму народу за высокую адзнаку нашай працы, за бацькоўскія клопаты аб развіцці савецкай навукі і вышэйшай адукацыі ў нашай краіне.

Усіх нас радуе яшчэ і тое, што ганаровай узнагароды Беларускі універсітэт, які носіць імя Вялікага Леніна, удастоен у юбілейным годзе, напярэдадні 50-годдзя Савецкай улады.

За мінулае паўстагоддзе савецкай сацыялістычнай дзяржавы, народжанай Кастрычніцкай рэвалюцыяй, мы прайшлі складаны, гераічны шлях. Гэта шлях ад адсталасці да вышэйшага прагрэсу ва ўсіх галінах жыцця нашага народа — піянера рэвалюцыйнага пераўтварэння грамадства, увасобіўшага ў жыццё вялікія ідэі марксізма-ленінізма.

Прыемна асведамляць, што большую частку гэтага паўвекавога шляху прайшоў і наш універсітэт. Яго развіццё непарыўна звязана з развіццём нашай многанацыянальнай Радзімы і яе неад'емнай часткі—Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Створаны па ўказанню Уладзіміра Ільіча ў той час, калі краіна наша перажывала разруху, голад, эпідэміі, калі на вялікай частцы яе тэрыторыі яшчэ працягвалася грамадзянская вайна, універсітэт ператварыўся цяпер у буйнейшы цэнтр навукі і падрыхтоўкі высококваліфікаваных спецыялістаў.

За гады існавання са сцен першынца вышэйшай адукацыі рэспублікі выпушчана больш 20 тысяч фізікаў, хімікаў, матэматыкаў, філолагаў, юрыстаў, журналістаў, геаграфаў, урачоў і іншых спецыялістаў для народнай гаспадаркі і культуры. Выпускнікі ВНУ працуюць у сярэдніх школах, тэхнікумах, у вышэйшых навучальных установах, інстытутах і лабараторыях Акадэміі навук рэспублікі, у партыйных і савецкіх органах. Многія з тых, каму універсітэт даў пуцёўку ў жыццё, сталі выдатнымі партыйнымі і дзяржаўнымі работнікамі, вучонымі, вядомымі дзеячамі літаратуры і мастацтва. Тут атрымалі глыбокія веды і прайшлі школу палітычнага выхавання такія вядомыя ў краіне і за яе межамі літаратары, як Кандрат Крапіва, Пятро Глебка, Пятрусь Броўка, вядомы вучоны АН СССР Л. А. Арцімовіч. Многія студэнты і выпускнікі універсітэта, прафесары і выкладчыкі, лабаранты і служачыя прымалі актыўны ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Не ўсе яны дажылі да радаснага дня перамогі. Сотні выпускнікоў універсітэта ўдастоены высокіх узнагарод за подзвігі і самаадданую працу на карысць нашай вялікай Радзімы.

Вялікая роля нашага універсітэта ў развіцці вышэйшай адукацыі ў рэспубліцы. На базе яго факультэтаў былі створаны такія цяпер буйныя вышэйшыя навучальныя ўстановы, як палітэхнічны, педагагічны, медыцынскі інстытуты, інстытут народнай гаспадаркі. Будучы старэйшым навукова-даследчым цэнтрам рэспублікі, Беларускі дзяржаўны універсітэт унёс вялікі ўклад у станаўленне рэспубліканскай Акадэміі навук, дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна і іншых навукова-даследчых устаноў.

Прыемна гаварыць, калі ўсё пазнаецца ў параўнаннях. А параўноўваць ёсць што. У 1921-22 навучальным годзе ва універсітэце на двух яго факультэтах навучалася 1.390 студэнтаў і працавала менш за сотню навукова-педагагічных супрацоўнікаў, у тым ліку 14 прафесараў. Цяпер на дзевяці факультэтах і на завочным аддзяленні універсітэта навучаецца больш як 14 тысяч студэнтаў, або ў 10 разоў больш у параўнанні з годам адкрыцця вну. На кафедрах і ў лабараторыях працуе цяпер каля 900 навукова-педагагічных супрацоўнікаў, у тым ліку больш за 370 дактароў і кандыдатаў навук. 40 год назад ва універсітэце была адкрыта аспірантура. Тады ў яе было прынята 35 чалавек; цяпер жа колькасць аспірантаў перавысіла 400 чалавек.

Штогод расце колькасць супрацоўнікаў, якія абараняюць кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Толькі за апошнія два гады абаронена больш як 10 доктарскіх і больш 60 кандыдацкіх.

Непазнавальна змянілася матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта. У 1921 годзе ён пачынаў працу ў невялікіх памяшканнях, меў усяго некалькі лабараторый. Зусім іншая карціна цяпер. Пабудаваны цудоўны галоўны корпус і корпус радыёфізікі і электронікі, новыя інтэрнаты. Будуецца новы корпус для хімікаў, закладзен падмурак яшчэ аднаго інтэрната. Маюцца сотні кабінетаў і лабараторый, у тым ліку больш дзесяці праблемных, абсталяваных сучаснымі прыборамі. Усё гэта стварае ўсе неабходныя ўмовы для плённага навуковага працэсу і выканання вялікага аб'ёму навуковых даследаванняў і дагаворных работ.

Беларускі універсітэт вядомы не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Штодзень пашыраюцца яго міжнародныя сувязі. У сценах універсітэта ўсё часцей і часцей праводзяцца навуковыя канферэнцыі, сімпозіумы і іншыя сустрэчы вучоных па самых розных праблемах навукі. Нашы прадстаўнікі выязджаюць з навуковымі дакладамі і паведамленнямі ў многія краіны свету.

Сваім паўсядзённым жыццём Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна адчуваў і адчувае пастаянныя клопаты і ўвагу з боку Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і ўрада рэспублікі, партыйных, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. Гэтыя клопаты і ўвага ідуць па ўсіх лініях, датычацца самых разнабаковых галін дзейнасці універсітэта. Мы выражаем за гэта нашу глыбокую шчырасць і падзяку.

Таварышы! Атрымаць узнагароду — вялікі гонар. Але ўзнагарода многаму і абавязвае.

У адказ на клопаты партыі і ўрада, выконваючы гістарычныя рашэнні XXIII з'езда КПСС, Пастанову ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб паляпшэнні работы вышэйшай школы, калектыў Беларускага універсітэта прыкладзе ўсе намаганні, каб няўхільна ўдасканальваць вучэбна-метадычную, навукова-даследчую і палітыка-масавую работу, павышаць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. У гэтым мы бачым наш найпершы абавязак галоўнага напрамку ўсёй нашай практычнай дзейнасці. Мы завяраем Камуністычную партыю і Савецкі ўрад, што Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэт імя У. І. Леніна будзе і надалей ісці ў першых шарэнгах развіцця навукі і вышэйшай адукацыі ў нашай краіне.

ЭСТАФЕТА ПАКАЛЕННЯЎ

(З прамовы загадчыка кафедры гісторыі філасофіі і логікі І. М. ЛУШЧЫЦКАГА)

□ □

Вялікая радасць, узнёсласць і гордасць перапаўняюць нашы сэрцы ў гэты святочны час уручэння нашаму універсітэту высокай урадавай узнагароды — ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга!

Дазвольце мне ад імя прафесараў, дацэнтаў і выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна прынесці глыбокую ўдзячнасць ЦК КПСС і Савецкаму ўраду, ЦК КП Беларусі і Савету Міністраў БССР за высокую ацэнку нашай сціплай працы ў галіне навукі і падрыхтоўцы кадраў народнай інтэлігенцыі, за вялікую ўрадавую ўзнагароду!

Я ўспамінаю другую палову дваццатых гадоў, калі ва універсітэт прыйшла «маладая гвардыя рабочых і сялян», рабфакаўцаў, юнакоў і дзяўчат, акрылёных гарачым заклікам У. І. Леніна «вучыцца камунізму, авалодваць усімі ведамі, набытымі чалавецтвам». Гэта была верная і адданая справе рэвалюцыі моладзь. Сярод студэнтаў былі ўдзельнікі грамадзянскай вайны, людзі з яшчэ незарубцаванымі ранамі. Многа было рабочых у пракураных, зношаных куртках і сялянскіх хлопцаў-сельсаветчыкаў, актывістаў камітэтаў беднаты. Мы прагнулі ведаў і накінуліся на іх з нецярплівай жаднасцю.

Мы былі студэнтамі, а гэта, вядома, — бурныя спрэчкі аб новым жыцці, гарачыя дыспуты ў перапынках, мора камсамольскіх песен. Але мы былі САВЕЦКІМІ студэнтамі, грамадзянамі краіны, якая будавала сацыялізм. Вось чаму мы не замыкаліся ў кніжныя сховішчы, у цішыню бібліятэк. Памяталі, што мы перш за ўсё будаўнікі новага свету. У нас жыло пачуццё адказнасці перад народам і грамадствам. Мы не толькі вывучалі філасофію і палітэканомію, хімічныя формулы і фізічныя законы, а перш за ўсё імкнуліся жыць па-ленінску, гэта значыць, добра і выдатна вучыцца, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. Мы добраахвотна стваралі школы для рабочых, змагаліся з варожай ідэалогіяй, з дзіцячай беспрытульнасцю, узнімалі будынкі Дома урада і Дома селяніна. Пры гэтым мы не ведалі ні фанабэрыстасці, ні пустога скептыцызму, ні нуднага спакою і стомы. Так складаліся непахісныя традыцыі нашага універсітэта — актыўна ўдзельнічаць у агульнанародным жыцці. Яшчэ Вялікі Ленін заклікаў савецкую моладзь, каб яна сваю адукацыю, сваё навучанне злучала з працай рабочых і сялян, каб яны не замыкаліся ў сваёй школе і не абмяжоўваліся толькі чытаннем камуністычных кніг і брашур. Толькі ў працы сумесна з рабочымі і сялянамі можна стаць сапраўднымі камуністамі.

Тады наш атрад быў нешматлікім, а зараз ён налічвае больш 14 тысяч чалавек.

Нядаўна універсітэту споўнілася 45 гадоў. Сённяшняя студэнцкая моладзь — высокаінтэлектуальная, гарачая ў творчасці, нястомная ў працы.

Прымаючы эстафету студэнтаў папярэдніх гадоў і ўзбагачаючы універсітэцкія традыцыі, сённяшнія студэнты ў час адпачынку едуць на цаліну, дапамагаюць будаваць і ўпрыгожваць наш родны горад, займаюцца з рабочай моладдзю і вучацца старанна і глыбока, каб потым плённа ўдзельнічаць у творчым пазнанні і пераўтварэнні света ў імя людзей.

Наш універсітэт — дзецішча савецкага народа, узор вялікага клопату партыі і ўрада аб навуцы. Яго першыя будынкі ўзводзіліся рабочымі і салдатамі. Зараз у нас маюцца прыгожыя будынкі, цудоўна абсталяваныя памяшканні, лабараторыі вялікага навуковага размаху. Нашаму палацу навукі можа пазайздросціць любы універсітэт Еўропы. Але справа не толькі ў гэтым. Вельмі трапна па гэтаму пытанню гаварыў вядомы наш вучоны К. А. Ціміразеў:

— Універсітэт,—гэта жывы арганізм, жывую душу ў гэты [illegible] арганізм уносяць жывыя людзі, і ніякія збудаванні, ніякія раскошныя абсталяванні не заменяць таго, што дае энергія і натхнёны прыклад, прыклад адданага навуцы таленавітага выкладчыка.

Наш універсітэт ганарыцца сваімі таленавітымі прафесарамі, дацэнтамі, выкладчыкамі, якія ўсе свае сілы, шчодрасць душы аддаюць справе выхавання студэнтаў і аспірантаў, актыўна садзейнічаюць камуністычнаму выхаванню савецкіх людзей.

Сёння мы ўсе, як ніколі, перапоўнены імкненнем ісці да яшчэ большых і яркіх спраў, здзяйсненняў, якія былі б варты юбілейнага года краіны Саветаў і патрабаванняў грамадства, якое будуе камунізм.

Высокая ўрадавая ўзнагарода нашага універсітэта — гэта адначасова і ганаровы вексаль, які нам дадзены на будучае, які мы павінны аплаціць нашай адданасцю справе, новымі здзяйсненнямі на карысць сацыялістычнай Радзімы. Гэта адначасова і выражэнне вялікай народнай пашаны і веры ў творчыя здольнасці нашага калектыва, у яго высокія здольнасць, творчы талент.

Такое давер'е нашай партыі і ўрада, давер'е народа патрабуе ад нас яшчэ больш палымяна і самааддана любіць Камуністычную партыю, сацыялістычную Радзіму, быць заўсёды гатовымі да любых здзяйсненняў, на якія яны нас паклічуць.

Дарагія таварышы! На яркачырвоным сцягу універсітэта палае ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. У гэты святочны і ўрачысты час я заклікаю ўвесь калектыў БДУ высока несці гэты сцяг, пад якім змагалася не толькі вытворчасць, школы, выдавецтвы і іншыя культурныя ўстановы, але і інстытуты рэспублікі. Дастаткова сказаць, што ў нашым інстытуце працуе 87 выхаванцаў універсітэта, з іх 42 прафесары і дацэнты. Выпускнікоў універсітэта можна сустрэць у Акадэміі навук БССР і ў кожным інстытуце рэспублікі і тэхнікуме.

У гэтай зале я бачу многа сваіх сяброў, з якімі разам вучыўся ва універсітэце. Мне, камандзіру Чырвонай Арміі, выпала шчасце ў кастрычніку 1921 года быць прынятым у лік першых студэнтаў БДУ. Мне таксама пашанцавала быць і ў ліку першых яго выпускнікоў. Нягледзячы на цяжкасці тых гадоў, нашы выкладчыкі рабілі ўсё для таго, каб выхаваць нас самаадданымі будаўнікамі сацыялізма, сумленнымі людзьмі і патрыётамі Радзімы. З удзячнасцю ўспамінаю сваіх настаўнікаў: першага рэктара БДУ Пічэту, прафесараў Нікольскага, Вальфсона, Перцава і многіх іншых.

Не пазнаць цяпер універсітэта, расквітнеўшага асабліва ў апошнія гады. Ён аказвае вялікую дапамогу ўсім вышэйшым навучальным установам рэспублікі, у тым ліку і нашаму інстытуту. Нашы выкладчыкі, студэнты карыстаюцца паслугамі выдатных універсітэцкіх лабараторый, атрымліваюць неабходныя кансультацыі ў буйнейшых вучоных, якімі так багаты універсітэт. Я глыбока перакананы, што ардэнаносны БДУ імя У. І. Леніна і надалей будзе для нас прыкладам у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, самаадданых будаўнікоў самага светлага грамадства — камунізма.

Адданасць справе вялікага Леніна, справе Камуністычнай партыі, справе народа — гэта адзнака нашых поспехаў, нашых добрых спраў на карысць народа, адзнака таго пачэснага месца, якое займае універсітэт сярод вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Але, як у свой час сказаў вялікі рускі рэвалюцыянер-дэмакрат В. Г. Бялінскі, «без барацьбы няма заслугі, без заслугі няма ўзнагароды, а адно пакаленне савецкіх настаўнікаў, вучоных, партыйных работнікаў. Мы памятаем: няма больш высакародных і велічных задач, чым тыя, што пастаўлены перад намі Камуністычнай партыяй, няма больш узнёслай, прыгожай долі, чым быць стваральнікамі цудоўнага свету: свету без зброі, войн, свету свабоды і прагрэсу — свету Камунізма!

Вялікія задачы, светлыя натхняючыя перспектывы адкрыты перад намі!

З гэтай пачэснай трыбуны я ад імя ўсяго прафесарска-выкладчыцкага калектыва універсітэта яшчэ раз запэўніваю, што мы, прыняўшы высокую ўзнагароду, станем яшчэ больш упартымі ў працы, нястомнымі ў пошуках, яшчэ больш згуртаванымі вакол роднай партыі і нашага ўрада! Мы заўсёды былі і будзем вернымі байцамі партыі! Нашы сэрцы, нашы думкі, наша падзяка — табе, Партыя, табе, Народ!

У НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ



Урачысты сход закончыўся вялікім канцэртам, у якім прынялі ўдзел вядомыя майстры мастацтваў Беларусі, а таксама самадзейныя артысты нашага універсітэта.

Фота А. Кадзета.

ВЕЛІЧНЫ ПРЫКЛАД

(З прамовы рэктара Мінскага педінстытута імя А. М. Горкага І. Е. ЛАКІНА)

Ад імя калектыва ўсіх вышэйшых навучальных устаноў Беларусі перадаю цёплыя віншаванні старэйшай навучальнай установе рэспублікі ў сувязі з узнагароджаннем ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Сорак пяць год, якія пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі прайшоў універсітэт, адзначаны вялікімі поспехамі і перамогамі. Дзякуючы клопатам партыі і народа, БДУ ператварыўся ў буйнейшы цэнтр навукі і падрыхтоўкі кадраў. Ён забяспечвае высокакваліфікаванымі спецыялістамі не толькі рэспубліку, але і многія краіны замежжа.

Дзякуючы клопатам Камуністычнай партыі, Савецкага ўрада, усяго народа, з кожным годам узбагачаецца навукова-тэхнічная база універсітэта. Яго шматлікія лабараторыі маюць самае сучаснае абсталяванне. Гэта дае магчымасць узброіваць студэнтаў глыбокімі ведамі, вучыць іх звязваць тэорыю з практыкай.



НА ЗДЫМКУ: у адной з лабараторый хімфака.

Фота А. КАДЗЕТА.

ВІНШАВАННІ ЮБІЛЯРА

Дацэнта кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі Рыгора Аронавіча Левіна добра ведаюць ва універсітэце. Звыш сарака год яго жыццё звязана з дзейнасцю нашага калектыва. Яго лекцыі па логіцы, дыялектычнаму і гістарычнаму матэрыялізму заўсёды выклікаюць вялікую цікавасць у студэнтаў, [illegible] вылучаюцца глыбокім зместам і вялікім пранікнёным уздзеяннем на слухачоў. Рыгор Аронавіч вядзе плённую навуковую працу па актуальных праблемах ленінскага этапу марксісцкай філасофіі. Нядаўна вялікае даследаванне па тэорыі пазнання ў галіне дыялектычнага матэрыялізму Р. А. Левіна рэкамендавана да абароны ў якасці доктарскай дысертацыі.

Днямі адбылося ўрачыстае пасяджэнне пашыранага саставу кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі, прысвечанага шасцідзесяцігоддзю з дня нараджэння Р. А. Левіна. Уступным цёплым словам пасяджэнне адкрыў загадчык кафедры прафесар В. І. Сцяпанаў. У дакладзе дацэнта В. А. Бадзяя была адлюстравана багатая навукова-педагагічная і таксама грамадска-палітычная дзейнасць юбіляра. Прамоўца падкрэсліў вялікія заслугі Рыгора Аронавіча перад універсітэтам і рэспублікай.

Пасля даклада імяніннік а сардэчна віншавалі загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі І. М. Лушчыцкі, загадчык кафедры палітэканоміі С. Я. Янчанка, загадчык кафедры навуковага камунізма М. Р. Круцько, рэктар Мінскага вячэрняга універсітэта марксізма-ленінізма Р. А. Урбановіч, прадстаўнік юрыдычнага факультэта, з якім цесна звязаны юбіляр, доктар юрыдычных навук І. І. Гарэлік, старшы выкладчык Я. В. Пятушкова і іншыя. Яны пажадалі Рыгору Аронавічу здароўя, шчаслівага даўгалецця і новых поспехаў у навуковых даследаваннях і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў. Юбіляру былі ўручаны прывітальныя адрасы і каштоўныя падарункі.

Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» далучаецца да гэтых віншаванняў і ў сваю чаргу жадае Рыгору Аронавічу Левіну плённай працы на славу нашага ардэнаноснага універсітэта.

А. Якімчык.

Рэдактар М. І. ЮСЬКА.

АТ 17289 Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, І паверх, п. 106, тэл. Б-2-07-19, Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 634.